аналітычны. Яны маюць сваю спецыфіку і накіраваны на тое, каб пры мастацкай рэканструкцыі былі захаваны рэгіянальныя асаблівасці, мастацкі стыль, а сама імпрэза ці вытворчасць адбылiся без празмерных высілкаў; каб працэсам была ахоплена мэтавая аўдыторыя і рэканструкцыя праходзіла з выхаваўчым, асветніцкім эфектам. Найбольш удалыя прыклады комплекснай мастацкай рэканструкцыі звычайна звязаны з заснаваннем і дзейнасцю музеяў-скансэнаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік / аўтар-укл. Т. Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.

## МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА Ў ФАЛЬКЛОРЫ

**Матэрыяльная культура ў фальклоры** – *апісанне элементаў традыцыйнага аддзення, прылад працы і аздаблення жылля носьбітаў традыцыі ў помніках іх вуснай народнай творчасці, а таксама тэхналогіі народных рамёстваў, якія перадаюцца вусным шляхам.* Адна з апошніх дэфініцый па традыцыйнай культуры вуснага тыпу – «нематэрыяльная культурная спадчына» (прапанаваная ЮНЭСКА ў 2003 годзе) – уключае «ўзоры вуснай народнай творчасці і тэхналогіі рамёстваў». Гэта невыпадкова, паколькі тэхналогіі вытворчасці, якія гістарычна склаліся і сталі традыцыйнымі, грунтуюцца на ручной працы, звязаны са светапоглядам і адаптацыяй этнасу. Часта традыцыйныя віды артэфактаў і спосабы іх дэкаратыўнага аздаблення адлюстроўваюць міфалогію і народную эстэтыку або дапаўняюць іх семіятычна, у асаблівасці ў тым выпадку, калі фрагменты вуснай народнай творчасці страчаны або існуюць у латэнтным (схаваным) выглядзе (касмаганічная сімволіка велікодных яек-пісанак). Магчымыя і «зваротныя» працэсы, калі фальклорныя крыніцы дапамагаюць аднавіць згубленыя тэхналогіі рамёстваў (рэканструкцыя беларускай дуды як мастацкага і культурнага феномену ў XXI стагоддзі).

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск: Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – С. 46 – 48, 43.

## МЕТАД ДЭМАНСТРАТЫЎНАЙ АНТРАПАТЭХНІКІ

**Метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі** (ад *ст.-грэч.* ἄνθρωπος – чалавек і *лац.* dēmonstrātiō – звяртанне ўвагі, паказванне) – *традыцыйная*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*методыка навучання мастацтву, калі навучэнец-пераемнік (пры непасрэдным кантакце) адсочвае і капіруе дзеянні майстра-настаўніка.* На гэтым метадзе заснавана перадача сацыяльнага і мастацкага вопыту ў культурах вуснага тыпу, калі навучанне вядзецца «з голаса на голас» (навучанне спевам і аповеду) ці «з рукі на руку» (навучанне рамёствам і промыслам). Метад забяспечвае захаванне мастацкага стылю і тэхналогій творчасці, спрыяе фарміраванню субкультуры носьбітаў традыцыі. Такім чынам у Беларусі захоўваюцца традыцыі неглюбскага традыцыйнага ткацтва і веткаўскага іконапісу, цэнтральнабеларускай этнафоніі ў гурце «Калыханка» Міханавіцкага дома фальклору, цэнтральнабеларускай харэапластыкі ў мядоцкім гурце «Берагіня» і інш. Такі тып навучання з'яўляецца своеасаблівым «гарантам захавання аўтахтоннай культуры» і сёння суадносіцца з паняццем «нематэрыяльная культурная спадчына чалавецтва».

### ЛІТАРАТУРА

1. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск: Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – С. 13, 100.

## РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ЭТНАМАСТАЦТВА

**Рэвіталізацыя этнамастацтва** (ад *лац.* re- – аднаўленне і vita – жыццё, літаральна – **вяртанне жыцця**) – *практычнае аднаўленне працэсу стварэння і дэманстрацыі элементаў этнічнага мастацтва ва ўмовах іх першапачатковага існавання (ландшафтавых і сацыяльна-культурных).* Пры пісьмовай і паслядоўнай рэвіталізацыі спажыўцы мастацтва атрымліваюць, фактычна, аўтэнтычны і якасны прадукт творчасці носьбітаў традыцыі. Рэвіталізацыю практыкуюць, калі па нейкіх абставінах мастацкая традыцыя часова перарываецца (знікае ці ўваходзіць у схаваны, латэнтны стан). Час прыпынення мастацкай традыцыі можа быць розны – ад некалькіх гадоў (вяртанне да жыцця ў побыце народа дызайну і музыкі славацкай валынкі-гайды, неглюбскага тэкстылю) да некалькіх дзесяцігоддзяў (дызайн і музыка беларускай валынкі-дуды). Галоўная ўмова – наяўнасць субкультуры носьбітаў і пераемнікаў у аўтэнтычным асяродку бытавання элемента этнічнага мастацтва.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Garaj, B.* Gajdyagajdošská tradíciana Slovensku. Bagpipeand Bagpipers Traditionin Slovakia / B. Garaj. – Bratislava: ASCO-Ústavhudobnej vedy SAV, 1995. – 277 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ